■ Спорт-тайм

# ЛІК МЕДАЛЯМ АДКРЫТЫ!

**У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра чарговае паражэнне «Гомеля» ў футбольным чэмпіянаце краіны, няўдалы старт жодзінскага «Тарпеда» ў Еўракубках і першыя медальныя поспехі беларускіх атлетаў на летняй Універсіядзе.**

**1.** Разгромам «Граніта» скончыліся першыя матчы **13-га тура чэмпіянату краіны па футболе.** Бабруйская «Белшына» на выездзе перайграла каманду з Мікашэвіч — 5:1. Дублем вылучыўся паўабаронца Яраслаў Багуноў. «Мінск» у гасцях і шанца не пакінуў «Віцебску» — 4:0. А вось «Гомель» атрымаў чарговае паражэнне. На гэты раз у сустрэчы з мінскім «Дынама» (0:1). Тым не менш, як адзначыў **галоўны трэнер «беласіняў» Вук РАШАВІЧ,** матч атрымаўся вельмі няпростым: «Добра гулялі ў першым тайме, стварылі нямала момантаў, але, на жаль, многія з іх не выкарысталі. Пасля перапынку намецілася праблемы ў нашай сярэдняй зоне, дзе гулялі маладыя хлопцы. Так, шмат памылак было пры перадачах. Другая палова сустрэчы далася няпроста, але абарона адпрацавала добра і сур'ёзнай работы ў Гутара не было. Нам патрэбны былі тры ачкі, і мы іх узялі — гэта галоўнае».



**Яўген ЦУРКІН заваяваў першы медаль для беларускай зборнай на летняй Універсіядзе.**

Адзначым астатнія вынікі 13-га тура: «Славія» — «Нёман» (0:0), БАТЭ — «Слуцк» (1:0).

**2.** У матчы першага кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы жодзінскае «Тарпеда» на выездзе саступіла албанскай камандзе «Кукесі» — 0:2. Першы мяч гаспадары забілі яшчэ на 9-й хвіліне. Да перапынку ў «белазаўцаў» было некалькі магчымасцяў ураўняць лік, але лічбы на табло змяніць так і не атрымалася. У другім тайме албанцы павялічылі сваю перавагу, забіўшы са штрафнога.

А вось салігорскі «Шахцёр», наадварот, упэўнена абыграў ірландскі «Гленавон» — 2:1. Гаспадары толькі ў самым канцы матча здолелі размачыць лік. Матчы ў адказ адбудуцца ў Жодзіне і Салігорску адпаведна 9 ліпеня.

Нагадаем, што матч 2-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў БАТЭ правядзе на хатняй арэне 15 ліпеня супраць ірландскага «Дандолка».

**3. Першы медаль на летняй Універсіядзе,** якая праходзіць у Паўднёвай Карэі, для беларускай каманды заваяваў плывец Яўген Цуркін. На сваёй каронцай дыстанцыі 50 м батэрфляем наш спартсмен саступіў бразільскаму плыўцу і заваяваў «серабро». Адзначым, што ў фінал гэтага заплыву Цуркін адабраўся з лепшым часам.

**4. Зборная Чылі ў першыню ў гісторыі заваявала Кубак Амерыкі.** У фінале галоўнага турніру Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі чылійцы ў серыі пенальці (4:1) перайгралі шматразовых чэмпіёнаў свету — каманду Аргенціны. У матчы за «бронзу» зборная Перу перамагла парагвайцаў (2:0).

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.47 | 21.41 | 16.54 |
| Віцебск — | 4.39 | 21.39 | 17.00 |
| Магілёў — | 4.37 | 21.32 | 16.55 |
| Гомель — | 4.43 | 21.19 | 16.36 |
| Гродна — | 5.04 | 21.55 | 16.51 |
| Брэст — | 5.14 | 21.47 | 16.33 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 8 ліпеня. Месяц у сузор'і Рыб.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Нараджэнне Іаана Прадцечы.*
***К.*** *Кіры, Бенядзікта, Кірылы, Мяфодзія.*



Фота Надзеі БУЖАН.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 7 ЛІПЕНЯ



**1796** год — нарадзіўся (вёска Малюшычы, цяпер Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці) Ян Тадэвушавіч Чачот, беларускі паэт, фалькларыст. Працаваў у кіраўніцтве радзівілаўскімі маёнткамі. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў таемных студэнцкіх таварыстваў філаматаў і філарэтаў, сябар Адама Міцкевіча. У 1823 годзе сасланы ва Уфу, затым у Цвер. З 1833 года жыў і працаваў на Лепельшчыне і Навагрудчыне. Аўтар балад, заснаваных на беларускім фальклоры. Выдаў слоўнік беларускай мовы, 6 фальклорных зборнікаў «Вясковыя песенькі», у якіх змешчана каля 1000 беларускіх народных песень. Пісаў вершы і крытычныя артыкулы. Памёр у 1847 годзе.

**1882** год — нарадзіўся Янка Купала, беларускі паэт, драматург, публіцыст, перакладчык, грамадскі дзеяч; класік беларускай літаратуры. Народны паэт Беларусі (1925). Аўтар зборнікаў паэзіі «Жалейка», «Гусляр», «Дарогі жыцця», паэм «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва», камедыі «Паўлінка», драмы «Раскіданае гняздо» і іншых твораў.

**1904** год — нарадзіўся Анатоль Адамавіч Альшэўскі, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, публіцыст. З 1925 года на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. На 3-й канферэнцыі (1926) і І з'ездзе КПЗБ (1928) выбраны членам ЦК. Быў рэдактарам друкаваных органаў ЦК КПЗБ газет «Бальшавік» і «Чырвоны сцяг». У 1927 годзе арыштаваны польскімі ўладамі, з 1928 года — у СССР па абмене палітычнымі вязнямі. З 1932 года працаваў у рэдакцыі Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б у Мінску, на прафсаюзнай рабоце. У публіцыстычных артыкулах выкрываў антыбеларускую палітыку ўрада Польшчы. У 1937-м рэпрэсаваны, у тым жа годзе памёр. Рэабілітаваны пасмяротна.

### Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт:**
*«Калі ж спакойна на душы,*
*Парожнім словам не грашы».*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

Дзень нараджэння. Нашы продкі лічылі дзень нараджэння не проста момантам фізічнага з'яўлення чалавека на свет, а з'явай гістарычнай, сацыяльнай і культурнай.

◈ Гістарычнай у тым сэнсе, што адначасова з іншымі каляндарнымі святамі (напрыклад, Новым годам) ён будзе структураваць жыццёвы шлях чалавека, падзяляючы яго на адпаведныя цыклы: дзяцінства, малалецтва, юнацтва, самастойнае жыццё, старасць.

◈ Падчас праходжання кожнага з гэтых цыклаў чалавек будзе займаць адпаведнае сацыяльнае становішча, мець свой, грамадствам прыняты, статут.

◈ Гэтая з'ява культурная, таму што суправаджаецца выкананнем адпаведных абрадаў, рытуалаў, іншых спецыфічных дзеянняў. Дзень нараджэння выбудоўвае вакол сябе адпаведную рытуальна-абрадавую прастору і задае свой сакральны час.

◈ У народным асяроддзі глыбока верылі, што на працягу сутак час мае неаднастайны характар. Напрыклад, не вельмі шчаслівымі для нараджэння лічыліся поўнач і поўдзень, а таксама момант заходу сонца. Акрамя таго, існавала паданне, што ў сутках ёсць шчаслівыя і нешчаслівыя хвіліны, гадзіны. У залежнасці ад таго, у які час нарадзіўся чалавек, такім будзе ўсё яго жыццё.

«Калі дзіця нараджалася ў прамежку часу ад поўначы і да поўдня, лічылася, што гэта спрыяльны фактар, які прадказвае, што малое даволі хутка пачне хадзіць, гаварыць, будзе разнабакова развітым чалавекам, у яго руках любая праца будзе спорыцца. Нам уяўляецца, што пры ўсёй адданасці прамога сэнсу прыказкі «ранняя пташка дзюбку калупае, позняя вочкі працірае» ад сітуацыі, што аналізуецца, яе сімвалічнае поле цалкам адпаведна параметрам найболей удалага часу нараджэння чалавека. Як вынікае з прыведзенага прыкладу, пачатак дня лічыўся лепшым для нараджэння чалавека.

Другая палова дня, г.зн. час ад поўдня і да поўначы, лічылася менш спрыяльнай. А момант заходу сонца лічыўся небяспечным часам, які аказвае істотны ўплыў на фізічны стан чалавека.

**ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске**
**информирует о признании недействительными:**
- страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездок за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 325259-325395.
УНП 100706519

## УСМІХНЕМСЯ

**Сяджу, стамілася, дачка мякка чымсьці стукае ззаду па галаве. Азірнулася, яна ўсміхаецца — расчэсвае мяне ёршыкам для ўнітаза. Стомленасць як рукой зняло.**

— Мілы, ты збіраешся прыгатаваць вячэру?
— Так!
— Сур'ёзна?
— З божай дапамогай.
— Гэта як?
— Дапаможаш, мая багіня?

**Знайшла ў мужа канверт з грашыма, падпісаны «Для каханай». Узрадавалася, падкінула туды за тыдзень тысяч дзвесце. Праз дзень муж купіў новае кола ў машыну.**

— Ну дождж сёння! З сабакам пагуляў і зразумеў, што зусім я не сабакавод.
— Чаму гэта?
— Таму што я свінапас!

**Нахабства — гэта калі муха мыецца, седзячы на мухабойцы.**

— Дарагая, ты куды сярод ночы?
— Пайду праверу, ці не гарыць дзе ў доме святло.
— І мне захапі кавалачак.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.092. Індэкс 63850. Зак. № 2745.
Нумар падпісаны ў 19.30 6 ліпеня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12